PolotskSU

# НАРОДНАЯ ПЕДАГОГІКА БЕЛАРУСАЎ ЯК СІСТЭМА КУЛЬТУРНАЙ ТРАНСМІСІІ Ў ТРАДЫЦЫЙНЫМ ГРАМАДСТВЕ[1]

**В.І. Мішына**
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларусь

Народная педагогіка беларусаў уяўляе сабой разгалінаваную сістэму сродкаў і метадаў выхавання, якая «з'явілася і развілася як вынік неабходнасці перадаваць ад пакалення да пакалення пэўныя працоўныя веды, умельствы і навыкі, а таксама правілы і нормы грамадскіх паводзін, без якіх была б немагчыма жыццядзейнасць чалавека» [1, с. 5]. Асаблівасцю традыцыйнага грамадства, як вядома, з'яўляецца безумоўная пераемнасць традыцыйных узораў, нормаў, светапоглядных асноваў; арыентацыя на пастаяннае ўзнаўленне сфармаваных на працягу стагоддзяў сацыяльных структур і спосабаў практычнай дзейнасці.

Менавіта пасродкам традыцыйных спосабаў, метадаў, інструментаў выхавання і навучання і забяспечваюцца названыя параметры традыцыйнага грамадства, інакш кажучы, ажыццяўляецца ў яго межах культурная трансмісія. Народная педагогіка, як сістэма традыцыйнага выхавання, прадугледжвае шматбаковае і інтэнсіўнае ўздзеянне на асобу дзіцяці, такім чынам яна арыентавана на забеспячэнне сацыялізацыі і інкультурацыі асобы, якія з'яўляюцца асноўнымі складнікамі культурнай трасмісіі [2].

Зыходзячы з класіфікацыі відаў культурнай трансмісіі, прапанаванай крос-культурным псіхолагам Дж. Бэры [2], у сістэме народнай педагогікі беларусаў можна вылучыць перш за ўсё механізмы вертыкальнай трансмісіі (перадача культурных каштоўнасцей, уменняў, вераванняў ад бацькоў да дзяцей) і гарызантальнай (засваенне сацыяльнага вопыту і традыцый культуры ў працэсе камунікацыі з аднагодкамі), а таксама трансмісіі непрамой (атрыманне вопыту ад іншых дарослых – родных, старэйшых членаў абшчыны,суседзяў і г.д.). Такім чынам, асноўнымі агентамі інкультурацыі і сацыялізацыі ў традыцыйным грамадстве з'яўляюцца сям'я, абшчына і група аднагодкаў.

Народная педагогіка беларусаў, як комлексная сістэма выхавання, ахоплівае ўсе сферы і накірункі жыццядзейнасці чалавека ў традыцыйным грамадстве, адпаведна, механізмы культурнай трансмісіі дзейнічаюць ва ўсіх гэтых сферах. На нашу думку, асаблівае значэнне ў гэтым плане набываюць працоўная дзейнасць, рытуальна-сімвалічная сфера і гульня.

**Працоўная дзейнасць.** Даследчыкі народнай педагогікі беларусаў адзначаюць, што адным з самых старажытных і эфектыўных сродкаў выхавання была праца. Улічваючы, што вытворчая дзейнасць традыцыйнай сям'і з'яўлялася асноўным спосабам яе існавання, ранняе далучэнне падрастаючага пакалення да працы было жыццёвай неабходнасцю. Вытворчы цыкл традыцыйнай сям'і ўключаў у сябе шматлікія віды працоўнай дзейнасці, перш за ўсё сельскагаспадарчай, а таксама рамесна-вытворчай і штодзённа-пабытовай. Задзейнічанымі ў гэтым працэсе ў той ці іншай ступені

[1] Праца падрыхтавана ў межах праекта № Г20Р-095 «Субкультура детства в дискурсе устной истории, языке и фольклоре Витебско-Псковского пограничья XX - начала XXI века».

PolotskSU

аказваліся абсалютна ўсе члены сям’і, і дзеці не з’яўляліся выключэннем. Этнографы XIX стагоддзя сведчаць аб тым, што ўжо з 4-5 гадоў дзецям даручалі выконваць пэўныя працоўныя дзеянні. Па меры сталення яны асвойвалі ўсё больш складаныя працоўныя аперацыі. Вельмі паказальным у гэтым плане з’яўляецца сведчанне М.В. Доўнар-Запольскага: «Дзеці з ранніх год выконваюць тыя ці іншыя гаспадарчыя абавязкі, і чым сям’я меней, тым раней сялянскі падлетак знаёміцца з суровай працай. З пяці год дзіця няньчыць сваіх маленькіх братоў і сясцёр, з 7-8 яно ўжо пастух, ідзе за возам і пад., з 12 год для хлопчыка пачынаюцца першыя практыкаванні ў земляробстве: ён зграбае сена, бaрануе, з пятнаццаці год бярэцца за цэп, касу, а яшчэ гады праз два і за саху, так што да 20 год ён ужо хлебароб, што прайшоў усе акадэмічныя курсы сялянскай гаспадаркі. Дзяўчына да 16-17 год ведае жаночыя работы» [3, с. 17].

Фактычна з першых гадоў жыцця дзіця атрымлівала магчымасць назіраць за працоўнымі працэсамі, а затым пакрысе далучацца да іх. Асноўным і найбольш арганічным сродкам фармавання працоўных навыкаў было навучанне на прыкладзе бацькоў ці старэйшых членаў сям’і [1, с. 24]. Акрамя таго, быў задзейнічаны і педагагічны патэнцыял вуснай народнай творчасці, накіраваны на фармаванне адпаведных нарматыўна-каштоўнасных арыентацый дзіцяці. Так, прыказкі і прымаўкі ў імператыўнай форме паказвалі значнасць працы як асновы жыццядзейнасці («Без працы жыць – толькі неба капціць», «Калі добра ўзарэш – то і ўраджай збярэш», «Як патрудзішся – так пажывеш» [4, с. 86-87]. Абрадавы і пазаабрадавы фальклор, адлюстроўваючы традыцыйную карціну свету, ўтрымліваў, апрача іншага, і важнейшыя звесткі практычнага характару (напрыклад, своеасаблівы «працоўны каляндар» валачобных песень з пералікам паслядоўнасці асноўных гаспадарчых работ: «Святы Казімір дровы сячэць … / Благавешчанне жытцо рушыць… / Свята вербніца сошкі правіць… / Чысты Чацвер заворываіць… / Радаўніца барануіць..» [5, с. 167-168]. Казкавая проза (асабліва сацыяльна-бытавога жанру) ў якасці станоўчага героя пазіцыянуе ў першую чаргу працоўнага чалавека, які, дзякуючы сваім мудрасці, кемлівасці, ўмельству, знаходзіць выйсце са складанага становішча, перамагае ў канфлікце з прадстаўнікамі антаганістычных сацыяльных слаёў («Як селянін зрабіўся памочнікам цара»; «Цана лусты хлеба», «Хлопец-нянька» і да т.п. [6, с. 24-25, с. 43-44, с. 175-177]). Акрамя таго, у сацыяльна-бытавых казках «народ, які асабліва высока цэніць шчырую працу, больш бязлітасна высмейвае гультайства, чым іншыя заганы» [6, с. 17].

**Рытуальна-сімвалічная сфера.** Неад’емным складнікам традыцыйнай культуры з’яўляецца сістэма каляндарных, сямейных і аказіянальных рытуалаў, якія, выконваючы функцыі сацыялізацыі, інтэграцыі і актуалізацыі сацыяльнага вопыту [7, с. 31-32], выступаюць у якасці важнейшых сродкаў культурнай трансмісіі. Удзел дзяцей і моладзі у рытуалах рэгламентаваўся сістэмай уяўленняў аб адпаведнасці тых ці іншых жыццёвых падзей ці прыродных цыклаў і ўзросту чалавека. Так, калі для радзіннага абраду рытуальны «тэкст» дзіцяці быў адным з асноўных [7, с. 41], то ўдзел дзяцей у пахавальных абрадах практычна выключаўся. У каляндарных абрадах найбольшая актыўнасць дзяцей і моладзі назіраецца ў калядны, а затым вяснова-летні перыяды, што адпавядае агульным ідэям нараджэння «новага», росту і росквіту прыроды [8, с. 168-169, с. 172-

PolotskSU

183]. З’яўляючыся ў рытуалах не пасіўнымі назіральнікамі, а выканаўцамі пэўных абрадавых роляў, дзеці засвойвалі агульныя правілы рытуальна-сімвалічных паводзін, адпаведныя вербальныя формулы (заклінанні, дыялогі, пажаданні), прынцыпы выкарыстання матэрыяльнай атрыбутыкі і абрадавы фальклор. Досыць добра, напрыклад, ілюструе сказанае вышэй, абрад «засявання», зафіксаваны Е.Р. Раманавым у пачатку ХХ ст.: «Дзень Новага года вядомы больш пад назвай «Васільля». Раніцай у гэты дзень сялянскія дзеці ходзяць па хатах з торбачкамі ў руках, у якія насыпана рознае зерне. Увайшоўшы ў хату, дзеці абсыпаюць яе жменяй зерня, прамаўляючы верш: «Ходзя Ільля / На Васіля, / Нося пугу, / Жыцяную. / Гдзе замахне - / Жыта расьце, / Гдзе ня махая, / Там ня бувая / А ў полі ядром, / А ў домі дабром! / Радзі, Божа, жыта-пшаніцу, усякаю пашаніцу» [9, с. 126].

Акрамя таго, існавала досыць вялікая група рытуалаў і рытуальных дзеянняў, функцыянальна скіраваных менавіта на сацыялізацыю і інкультурацыю дзіцяці (далучэнне дзіцяці да свету «культуры», сімвалічнае фарміраванне яго фізічных, разумовых здольнасцей, працоўных навыкаў, якасцей характару і да т.п). У першую чаргу гэта, безумоўна, радзінна-хрэсбінныя рытуалы (адразанне пупавіны, купанне, апрананне, наданне імя, інтэграцыя ў сямейную, вясковую і канфесійную супольнасць): «Пупавіну хлопчыку баба атрэзвае, палажыўшы на дубовую дошку, каб хлопец быў моцны як дуб, ці на тапарышча, каб ён добрэ трымаў сакеру да быў лоўкі рабоцько. А дзеваццы пупавіну баба атрэзвае, палажыўшы на прасніцу, або на чоўнік, каб яна як вырасце, была ахвотніца да жаночае работы» [10, с. 174]; «Калі народзіцца дзіця, бабка рыхтуе ваду купаць яго, а бацька кідае ў ваду срэбныя грошы, каб дзіця было багатым і чыстым» [9, с. 329]; «Покуль дзіцяці не хрысцяць, яму не можна класці сарочачкі, яго толькі кладуць у пялёнкі, зробленыя са старызны: сарачок маткі, бацька, бабкі, дзеда ці кагонебудзь з старшых. Робяць гэта дзеля таго, каб дзіця ва ўсём было, як яго бацькі, дзяды ці другія сроднікі» [10, с. 174]; «Кум і кума павінны на хрысцінах много праміж сябе гаварыць, каб дзіця было гаваркое да да людзей прыхільнае» [10, с. 180]. У працэсе далейшага росту і сталення дзіцяці рытуальным чынам маркіраваліся з’яўленне першага зуба і пачатак выпадзення малочных зубоў, пачатак хаджэння і маўлення, першы год з дня нараджэння, пераходы з адной полаўзроставай ступені дзяцінства ў другую, аваладанне некаторымі працоўнымі навыкамі: «Калі ў дзіцяці стануць бачныя першыя прыкметы прарэзвання зубоў, то трэба даваць яму грызці воўчы зуб: яны хутка прарэжуцца і будуць моцныя, падобна да воўчых» [11, с. 27]; «Калі дзіця своечасова робіць спробу «ад дыбак к ходу», то першая жанчына, якая гэта заўважыла, павінна зараз жа тройчы правесці нажом паміж ножак дзіцяці, каб канчаткова вызваліць яго ад «дзяціных путаў» [11, с. 29]; «Першае, што зробіць дзіця трэба ўкінуць у вагонь, та яно будзе ахвотно … рабіць, што схочэ» [10, с. 185]; «Каля таго часу як дзіця пачынае «бавіцца цацкамі»…, бацькі кладуць на стол кнігу, грошы, сякеру, зярняты і іншыя прадметы, падносяць дзіця і «прыцямліваюць», за што дзяцёнак ухопіцца, тое і будзе ведаць у дарослым стане» [11, с. 30].

**Гульня.** Спецыялісты ў галіне народнай педагогікі адназначна падкрэсліваюць выключны педагагічны патэнцыял гульні: «Гульня адыгрывала важнейшую ролю

PolotskSU

ў жыцці дзіцяці, развіцці яго фізічных і разумовых здольнасцей. У гульні дзеці ўдасканальваліся і вучыліся кіраваць сваімі асабістымі паводзінамі. У ёй спасцігаліся маральныя і этычныя нормы, набываліся жыццёва важныя веды, нараджалася пачуццё калектывізму, патрыятызму як вышэйшых маральных якасцей, неабходных любому грамадству» [12, с. 199]. Менавіта гульня як важнейшы элемент дзіцячай субкультуры, выступае ў якасці галоўнага сродка гарызантальнай культурнай трансмісіі (камунікацыя з аднагодкамі), але, разам з тым, з'яўляецца спосабам мадэлявання сацыяльных адносін, садзейнічае развіццю разумовых здольнасцей дзіцяці, засваенню працоўных навыкаў і маральных нормаў традыцыйнай супольнасці (то бок з'яўляецца інструментам трансмісіі вертыкальнай).

Сацыялізацыя і інкультурацыя дзіцяці пасродкам гульні адбываецца па шэрагу накірункаў, сярод якіх, на нашу думку, важнейшымі з'яўляюцца наступныя:

– засваенне сацыяльных роляў і правілаў паводзін паміж людзьмі (ролевыя і сітуацыйныя гульні: «У маці і дачку», «У дом», «У вяселле» і да т.п. [13, с. 192, с. 194]);

– авалодванне працоўнымі навыкамі (імітацыйныя гульні: «у сяўбу», «уборку ўраджаю», «Мак», «Проса», «Лён» і інш. [13, с. 192; 14, с. 375-377];

– развіццё фізічных і разумовых здольнасцей, кемлівасці, спрыту, наглядальнасці (рухомыя гульні, гульні з інвентаром, т.зв. «скаўцкія» і да т.п.: «Пікар», «Клёк», «Класы», «Краскі», «Хованкі», «Жгуцікі» і інш. [14, с. 247, 253, 306, 331, 336, 370]);

– засваенне ведаў аб навакольным свеце (гульні, дзе імітуюцца асаблівасці паводзін жывёл і птушак, пэўным чынам адлюстроўваюцца прыродныя і сацыяльныя з'явы: «Птушкі ляцяць», «Кароль», «Цар, злодзей і палач», «Французы і беларусы», «Мышка», «Каршун і качкі» і інш. [14, с.268, 286, 296, 310, 313, 317]);

– эстэтычнае выхаванне (засваенне дзіцем пачуцця рытму, рыфмы, музычнай гармоніі, эстэтыкі рухаў («забаўлянкі», «пацешкі», «гушкалкі» для самых маленькіх [13, с. 189-191], гульні з драматычнымі, вакальнымі і харэаграфічнымі элементамі: «Я малюшанькі», «Ку-ку», «Ручаёк» і г.д. [14, с. 373, 390-397, 414]).

Разглядаючы гульню як інструмент культурнай трансмісіі не варта выпускаць з-пад увагі і агульныя характарытыкі гульні як пэўнага соцыякультурнага феномена, паколькі яны таксама аказваюць істотны ўплыў на станаўленне і развіццё асобы ў экзістэнцыяльным сэнсе. Тут неабходна згадаць і агульную культуратворчую функцыю гульні (І. Хёйзінга), і такія яе рысы, як добраахвотны характар, наяўнасць правіл, арыентаванасць на гульнёвы працэс, парсторава-часавая абмежаванасць і інш. [15]

Такім чынам, народная педагогіка з'яўляецца адным з важнейшых механізмаў культурнай трансмісіі ў традыцыйным грамадстве, забяспечваючы пераемнасць соцыякультурных нормаў, стэрэатыпаў паводзін, сродкаў і спосабаў камунікацыі паміж людзьмі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Арлова, Г. П. Беларуская народная педагогіка / Г. П. Арлова. - Мінск : Народная асвета, 1993 г. – 120 с.
2. Черепова, А. А. Междисциплинарный подход к определению понятия «Культурная трансмиссия» [Электронный ресурс] / А. А. Черепова // Общество: философия, ис-

PolotskSU

тория, культура. – 2016. – №8. - Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/mezhdistsiplinarnyy-podhod-k-opredeleniyu-ponyatiya-kulturnaya-transmissiya. – Дата доступа: 21.11.2020.
3. Довнар-Запольский, М. В. Очерки семейственного обычного права крестьян минской губернии / М. В. Довнар-Запольский // Исследования и статьи, Т.1. – Киев, 1909. – С. 1-60.
4. Арлова, Г. П. Народная педагогіка ў выхаваўчай рабоце школы / Г. П. Арлова. – Мінск : ГВАЗТ «Маладняк», 1995. – 160 с.
5. Валачобныя песні / Склад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей, склад. муз. часткі В.І. Ялатаў. Рэд. тома К.П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980 – 560 с. – (Беларуская народная творчасць).
6. Сацыяльна-бытавыя казкі / Склад. тома і аўтар уступнага артыкула А. С. Фядосік, склад. каментарыяў Л. Р. Бараг ; рэд. тома В. К. Бандарчык. — Мінск : Навука і тэхніка, 1976. — 520 с. — (Беларуская народная творчасць).
7. Байбурин, А. К. Ритуал в традиционной культуре: Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов / А. К. Байбурин. – СПб. : Наука, 1993. – 240 с.
8. Бернштам, Т. А. Молодежь в обрядовой жизни русской общины XIX – начала XX в. / Т. А. Бернштам. – Л. : Наука, 1988. – 277 с.
9. Романов, Е. Р. Белорусский сборник. В 9 вып. / Е.Р. Романов. - 1886-1912. – Вып. 8: Быт белорусса. – Вильна, 1912. – 600 с.
10. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
11. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах. / Н.Я. Никифоровский – Витебск, 1897. – 336 с.
12. Ракава, Л.В. Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX-XX стст. / Л. В. Ракава. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 311 с.
13. Беларусы: у 8 т. Т.5. Сям’я. / В. К. Бандарчык, Г. М. Курыловіч, Т. І. Кухаронак [і інш.] ; рэдкал. : В. К. Бандарчык [і інш.]; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск : Бел. навука, 2001. – 375 с.
14. Гульні, забавы, ігрышчы / Склад. А. Ю. Лозка. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 1996. – 534 с. – (Беларуская народная творчасць).
15. Нестерова, Н. В. Игра как объект культурологического анализа [Электронный ресурс] / Н. В. Нестерова, К. Ю.Баннов // Вестник ЧГАКИ. – 2006. – №1 (9). – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/igra-kak-obekt-kulturologicheskogo-analiza. – Дата доступа: 21.11.2020.

PolotskSU

Министерство образования Республики Беларусь
Полоцкий государственный университет

# УСТОЙЧИВОЕ РАЗВИТИЕ ЭКОНОМИКИ: МЕЖДУНАРОДНЫЕ И НАЦИОНАЛЬНЫЕ АСПЕКТЫ

Электронный сборник статей
IV Международной научно-практической online-конференции

(Новополоцк, 26 ноября 2020 г.)

*Текстовое электронное издание*

Новополоцк
Полоцкий государственный университет
2020

Об издании – 1, 2

PolotskSU

1 – дополнительный титульный экран – сведения об издании

УДК 338.2(082)

**Устойчивое развитие экономики: международные и национальные аспекты** [Электронный ресурс] : электронный сборник статей IV Международной научно-практической online-конференции, Новополоцк, 26 ноября 2020 г. / Полоцкий государственный университет. – Новополоцк, 2020. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

Впервые материалы конференции «Устойчивое развитие экономики: международные и национальные аспекты» были изданы в 2012 году (печатное издание).

Рассмотрены демографические и миграционные процессы в контексте устойчивого развития экономики; обозначены теоретические основы, практические аспекты управления человеческими ресурсами; выявлены и систематизированы драйверы инклюзивного экономического роста в Беларуси и за рубежом; раскрыты актуальные финансовые и экономические аспекты развития отраслей; приведены актуальные проблемы и тенденции развития логистики на современном этапе; отражены современные тенденции совершенствования финансово-кредитного механизма; освещены актуальные проблемы учета, анализа, аудита в контексте устойчивого развития национальных и зарубежных экономических систем; представлены новейшие научные исследования различных аспектов функционирования современных коммуникативных технологий.

Для научных работников, докторантов, аспирантов, действующих практиков и студентов учреждений высшего образования, изучающих экономические дисциплины.

*Сборник включен в Государственный регистр информационного ресурса. Регистрационное свидетельство № 3061815625 от 23.05.2018.*

**№ госрегистрации 3061815625**

**ISBN 978-985-531-720-4** © Полоцкий государственный университет, 2020

PolotskSU

2 – дополнительный титульный экран – производственно-технические сведения

Для создания электронного сборника статей IV Международной научно-практической online-конференции «Устойчивое развитие экономики: международные и национальные аспекты» использованы текстовый процессор Microsoft Word и программа Adobe Acrobat XI Pro для создания и просмотра электронных публикаций в формате PDF.

Компьютерный дизайн обложки *М. С. Мухоморовой*
Технический редактор *С. Е. Рясова*, *А. А. Прадидова*
Компьютерная верстка *Т. А. Дарьянова*

Подписано к использованию 27.01.2021.
Объем издания: 18,8 Мб. Заказ 019.

Издатель и полиграфическое исполнение:
учреждение образования «Полоцкий государственный университет».

Свидетельство о государственной регистрации
издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий
№ 1/305 от 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 от 08.05.2014.

211440, ул. Блохина, 29, г. Новополоцк, Беларусь
тел. 8 (0214) 53 05 72,
e-mail: i.pozdnyakova@psu.by